# Усходняе партнэрства і беларуская грамадзянская супольнасьць

Далучэньне Беларусі да Ўсходняга партнэрства (УП), ініцыяванага Эўрапейскім Зьвязам, зьяўляецца самай значнай падзеяй апошняга часу ў разьвіцьці ўзаемадачыненьняў паміж Беларусьсю і ЭЗ. Новы фармат адносінаў ажывіў грамадзкую дыскусію, якая, аднак, па-ранейшаму адбываецца ў звужаных рамках, і ўзьняў надзеі на магчымыя перамены ў Беларусі праз паступовае збліжэньне з Эўрапейскім Зьвязам.

У краіне, якая доўгі час была па-за межамі эўрапейскіх працэсаў з прычыны палітыкі (сама-)ізаляцыі, прапанова ЭЗ далучыцца да Ўсходняга партнэрства была сустрэтая з энтузіязмам. Асабліва тое характэрна для большай часткі трэцяга сэктару, які цягам апошняга дзесяцігодзьдзя вызначаў свой парадак дня як эўрапеізацыя Беларусі. 2006-2007 гады прынесьлі больш напружаньня ў беларуска-расейскія стасункі, якое ўзмацнілася расейска-грузінскай вайной 2008 году. Узьнікла падстава для чаканьняў, што новыя вонкавыя варункі падштурхнуць да зьменаў у застылай унутрыпалітычнай сытуацыі і прывядуць да больш значнага ўплыву грамадзянскай супольнасьці на працэсы, якія адбываюцца ў Беларусі. Разам з тым, УП галоўным чынам успрымалася як новая магчымасьць і гістарычны шанец для Беларусі, а не як гарантыя пераменаў.

**Бліжэй Еўропы - толькі выгляд ці рэальны план?**

За апошнія паўтары гады таксама адбыліся пэўныя перамены ў афіцыйным дыскурсе: словы лібэралізацыя, правы чалавека, дэмакратычны шлях разьвіцьця, а таксама падкрэсьліваньне пільнай неабходнасьці прагматычнага ўрэгуляваньня адносінаў з ЭЗ сталі шырока ўжывацца афіцыйнымі асобамі Беларусі. Напрыклад, у чэрвені 2009 года тэма штомесячнага “адзінага дня інфармаваньня” (адно з галоўных мерапрыемстваў ідэалягічных адздзелаў па ўсёй краіне ад верху да нізу) называлася “Дыялёг Беларусь-Эўропа: бягучыя пытаньні”. Ягонае асноўнае пасланьне можна прадставіць цытатаю: “Эўрапейскі Зьвяз мае найноўшыя тэхналёгіі, магутныя інвэстыцыйныя магчымасьці і вялікі інтэлектуальны патэнцыял. Менавіта тое, што патрэбна для садзейнічаньня эканамічнай мадэрнізацыі Беларусі”. У намаганьні прадэманстраваць - у першую чаргу для ЭЗ - сваё жаданьне распачаць унутраны дыялёг улады пайшлі на стварэньне шэрагу кансультацыйных радаў, запрашаючы да ўдзелу некаторых прадстаўнікоў незалежнага грамадзтва.

Такі “уздым” пытаньняў эўрапейскай інтэграцыі Беларусі прывёў да пераменаў у грамадзкіх настроях. Грамадзтва ў Беларусі дагэтуль глыбока падзеленае па сваіх сьветапоглядах, аднак, паводле нядаўніх апытаньняў, расьце падтрымка ідэі эўрапейскай інтэграцыі.

Упершыню за апошнія некалькі год колькасьць тых, хто аддае перавагу эўрапейскаму выбару для Беларусі, трошкі перавысіла колькасьць тых, хто жадаў бы бачыць Беларусь у больш шчыльным саюзе з Расеяй. Аналітыкі прадказваюць далейшы рост у гэтым кірунку, часткова дзякуючы пераменам у афіцыйнай рыторыцы. Большасьць праваабаронцаў таксама адзначае зьніжэньне інтэнсіўнасьці палітычнага перасьледу ў параўнаньні з 2006-2008 гадамі.

**Грамадзянская супольнасць - сапраўдны матор пераменаў.**

Значная колькасьць суб'ектаў палітычнай і грамадзянскай супольнасьцяў намагалася скарыстацца момантам, каб актуалізаваць пытаньні эўрапейскай інтэграцыі ў грамадстве. У траўні 2009 года Аляксандр Мілінкевіч, лідэр Руху За Свабоду і найбольш вядомы апазыцыйны палітык у Беларусі і Эўропе, вырашыў правесьці Беларускі Эўрапейскі Форум з мэтай падтрымкі павароту Беларусі да Эўрапейскага Зьвязу. Форум меўся стаць сымбалем незваротнасьці працэсаў эўрапеізацыі Беларусі ды мабілізаваць прыхільнікаў беларускіх праэўрапейскіх сілаў, аб'яднаўшы іхны патэнцыял. Цягам трох месяцаў перад Форумам у 97 гарадах і мястэчках па ўсёй Беларусі былі арганізаваныя сходы па вылучэньні дэлегатаў. Падчас рэгіянальных сходаў таксама праводзіліся абмеркаваньні перавагаў эўрапейскага выбару для Беларусі, прэзэнтацыі магчымых карысьцяў ад ўдзелу ў эўрапейскіх праграмах. Экспэртамі былі распрацаваныя дакумэнты, што адлюстроўваюць выгады для розных сацыяльных групаў ад супрацоўніцтва і інтэграцыі з аб'яднанай Эўропай.

Лістападаўскі Форум стаў буйной палітычнай і грамадзкай падзеяй Беларусі ў 2009 годзе, удзел у якой узялі каля 1000 асобаў, сярод якіх былі дэпутаты Эўрапарлямэнту. Форум здолеў пацьвердзіць праэўрапейскую пазыцыю бальшыні суб'ектаў грамадзянскай супольнасьці, прыняць агульную стратэгію далейшай працы па пашырэньні ведаў пра перавагі эўрапейскай інтэграцыі сярод усіх сацыяльных групаў, уключэньні грамадзкага сэктару ў дыялёг з ЭЗ і нарошчваньня магчымасьцяў грамадзянскай супольнасьці плённа супрацоўнічаць з эўрапейскімі партнэрамі. Пры ўмове выкананьня ўсіх задачаў, прыняты плян дзеяньняў мае патэнцыял спрычыніцца да глыбокіх пераменаў у краіне.

Другім яскравым прыкладам мабілізацыі беларускай грамадзянскай супольнасьці на выклікі УП стала падрыхтоўка і ўдзел ейных прадстаўнікоў у Форуме грамадзянскай супольнасьці (ФГС) Усходняга партнэрства. Беларускія НДА паказалі, што маюць высокі арганізацыйны ўзровень і здольнасьць разьвіваць свае агульныя, вельмі рэлевантныя, прапановы што да інстытуцыяналізацыі ФГС і надзяленьня недзяржаўных суб'ектаў УП важнымі інструмэнтамі ажыцьцяўленьня маніторынгу ды ўдзелу ва ўзаемадзеяньні паміж ЭЗ і краінамі-партнэрамі. Высокі экспэртны ўзровень і падрыхтаванасьць беларускай дэлегацыі былі ключавымі

фактарамі пры прызначэньні Сяргея Мацкевіча, старшыні Асамблеі дэмакратычных НДА Беларусі, афіцыйным прадстаўніком ФГС у стасунках з Эўрапейскай камісіяй і Радаю міністраў УП. Дзейнасьць, што разгарнулася пасьля першага сходу ФГС у Брусэлі, можа прывесьці да стварэньня каардынацыйнага цэнтру НДА як на нацыянальным узроўні ў асяродку беларускіх суб'ектаў, так і на рэгіянальным – паміж краінамі-удзельніцамі УП. Такая каардынацыя можа забясьпечыць грамадзянскую супольнасьць больш выразным прадстаўніцтвам ва УП, шэрагам інструмэнтаў для разьвіцьця агульнанацыянальнага і, у будучым, рэгіянальнага парадку дня ва УП, магчымасьцю маніторынгу стасункаў і праектаў, якія ў асноўным ажыцьцяўляюцца на міжурадавым узроўні.

**Усходняе Партнёрства - уплыў на няўрадавыя арганізацыі.**

Аднак напрыканцы 2009 году першапачатковы энтузіязм стасоўна УП неяк згас з прычыны адсутнасьці істотнага прагрэсу ў пашырэньні прасторы і ролі для грамадзянскай супольнасьці ў Беларусі. Прававыя рамкі для трэцяга сэктару ў Беларусі амаль не зьмяніліся. Ня кажучы пра тое, што дагэтуль дзейнічае, хоць і зрэдку ўжываецца, артыкул 193-1, які прадугледжвае крымінальнаю адказнасьць за дзейнасьць ад імя незарэгістраванай арганізацыі, застаюцца ў сіле амаль усе іншыя абмежавальныя меры: складаныя працэдуры рэгістрацыі НДА і рэгулярныя адмовы ў ёй; вельмі высокія кошты на арэнду памяшканьняў; неабходнасьць у афіцыйнай рэгістрацыі міжнародных праектаў; падаткі на замежную дапамогу. Шырока разрэклямаваныя ўладамі кансультацыйныя рады, з запрошанымі туды шэрагам прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасьці, сталі ўсяго толькі фасаднымі ініцыятывамі, пазбаўленымі паўнамоцтваў у прыняцьці рашэньняў і, да таго ж, без мэханізмаў выкананьня рашэньняў.

Ёсьць пэўная колькасьць рызыкаў, якія суб'екты грамадзянскай супольнасьці бачаць ва УП. Галоўнае зь іх тычыцца засьцярогаў што да падыходу "ўрад перадусім і надусім". Існуе незадаволенасьць тым, што хоць ЭЗ і адчыняецца Беларусі, але ягоная мяккая пазыцыя ў асноўным можа служыць захаваньню і легітымізацыі існуючай аўтарытарнай сыстэмы, дзе ўлады, інтэнсыфікуючы стварэньне праўрадавых НДА, заменяць незалежныя НДА ў фінансаваных ЭЗ праектах. У выніку, гэта яшчэ болей маргіналізуе незалежныя НДА.

Таму вельмі важна працягваць рэгулярнае задзейнічаньне і кансультацыі з суб'ектамі грамадзянскай супольнасьці што да пытаньняў адносінаў паміж ЭЗ і Беларусьсю. З прычыны нязьменнасьці асноўных рысаў палітычнага рэжыму ў Беларусі, правільнае збалянсаваньне і разьмежаваньне паміж урадавымі праектамі і праектамі, накіраванымі на НДА, зьяўляецца пакуль неабходным падыходам. Парадак дня такіх праектаў мусіць быць у некаторай ступені

аўтаномным, асабліва па такіх пытаньнях, як свабода сродкаў масавай інфармацыі, абарона правоў чалавека і пра-эўрапейская дзейнасьць. Разам з тым, трэба заахвочваць суб'екты грамадзянскай супольнасьці выходзіць за рамкі канфрантацыйнай лёгікі і высоўваць больш рэалістычныя і пазытыўныя прапановы, якія будуць сувымерныя іхным здольнасьцям і рэсурсам, а таксама больш шырокім патрэбам грамадзтва. Такія прапановы толькі б выйгралі, калі б яны намагаліся ўлучыць паўсюль, дзе гэта толькі магчыма, рэгіянальныя і мясцовыя ўлады, бізнэс-структуры і іншыя недзяржаўныя ўстановы.

Адным з прыярытэтаў мусіць стаць далейшая разьвіцьцё кампэтэнцыі і экспэртных здольнасьцяў грамадзянскай супольнасьці. Гэта дазволіць ейным прадстаўнікам стаць карыснымі пасярэднікамі паміж дзяржаўнымі інстытуцыямі і партнэрамі ЭЗ ва ўсіх ініцыятывах і плятформах УП. Ужо ёсьць шэраг пазытыўных прыкладаў, якія падаюць Беларускі інстытут стратэгічных дасьледваньняў (БІСС), Офіс за дэмакратычную Беларусь і Кансорцыюм "ЕўраБеларусь". Глыбокія веды і ўдзел у эўрапейскіх сетках эпістэмалягічных супольнасьцяў (супольнасьці адмысловых ведаў сэктарных палітык ЭЗ) могуць стаць важкім аргумэнтам, дазваляючы суб'ектам грамадзянскай супольнасьці заняць месца легітымных суразмоўцаў у адносінах паміж ЭЗ і дзяржаўнымі ўстановамі. Такая практыка супольнае працы з ЭЗ і ўвядзеньне эўрапейскіх стандартаў і нормаў закладуць больш трывалы падмурак для рэальнага ўнутранага дыялёгу як на нацыянальным, так і мясцовым узроўнях.

Такім чынам, удзел Беларусі ва Ўсходнім Партнэрстве ўзьняў чаканьні беларускай грамадзянскай супольнасьці і стаў каталізатарам для мабілізацыі і інтэнсыфікацыі праэўрапейскай дзейнасьці ў Беларусі, але рэальныя заўважныя вынікі ад УП яшчэ толькі мусяць зьявіцца.

*Аляксандр Лагвінец*

**Аляксандр Лагвінец** з'яўляецца магістрам міжнародных адносінаў Беларускага Дзяржаўнага Універсітэта, паслядыпломную адукацыю атрымаў у Францыі. Некалькі разоў удзельнічаў у мясцовых і парламентскіх выбарах, у дадзены момант з'яўляецца дарадцам Аляксандра Мілінкевіча, старшыні беларускага руху "За Свабоду". Аўтар шматлікіх публікацый аб праблематыцы еўрапейскай інтэграцыі.